**УДК 39**

# СПАДЧЫНА БЕЛАРУСІ: СЯДЗІБА ХРАПТОВІЧАЎ У ШЧОРСАХ

***В.В. НОВАШ***
***(Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы)***

*Турызм у сучасным свеце з'яўляецца адным з самых масавых і інтэнсіўна развітых галін сусветнай гаспадаркі. Развіццё турыстычных функцый у сельскіх месцах з каштоўнай гістарычнай спадчынай неабходна для паляпшэння сістэмы дзяржаўных паслуг. Акрамя таго, стварэнне спрыяльных умоў для турызму, накіраваных на знаёмства з гістарычнай, культурнай і прыроднай спадчынай, важна для развіцця турыстычных магчымасцей. Сядзіба у Шчорсах, якая цяпер разбурана і трапіла ў забыццё, прарадзіма сям'і Літавора Храптовіча – важны помнік беларускай культуры, які можа стаць гістарычным і турыстычным цэнтрам Беларусі.*

***Ключавыя словы:*** *гістарычная спадчына, турыстычныя магчымасці, гісторыка-культурны патэнцыял.*

**Уводзіны**. Гісторыка-культурны патэнцыял Беларусі фарміраваўся на працягу многіх стагоддзяў. Дзяржаўныя ўтварэнні IX ст. у басейнах рэк Заходняя Дзвіна і Днепр – Полацкае і Турава-Пінскае княствы. Хрысціянізацыя ў канцы X ст. па ўсходнім абрадзе, што мела вырашальнае значэнне для культурнага развіцця беларускіх зямель. Шырока вядомыя імёны асветнікаў XII ст.: Еўфрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага, ювеліра Лазара Богшы, аўтара ўнікальнага крыжа – шэдэўра нацыянальнага і сусветнага мастацтва, які, на жаль, быў згублены ў ваенным віхуры мінулага стагоддзя. Славутая гісторыя нашых гарадоў. Полацк адным з першых у Кіеўскай Русі набыў палітычную незалежнасць. Багатую гісторыю ўвасобілі ў сабе яго помнікі: Спаса-Еўфрасінеўскі манастыр, Сафійскі сабор, Богаяўленскі манастыр. Наваградак – першая сталіца і адукацыйны цэнтр адной з найбуйнейшых феадальных манархій Еўропы – Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Старабеларуская мова. Яна была і дзяржаўнай, і паўсядзённай гутарковай мовай. На ёй ствараліся летапісы, хронікі, мастацкія, рэлігійныя, навуковыя творы, пісаліся берасцяныя граматы – пасланні на бяросце, якімі абменьваліся простыя людзі. Статут Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ад 1588 г. – самы дасканалы збор законаў сярэднявечнай Еўропы, класічны ўзор феадальнага права, які дзейнічаў на беларускіх зямлях да 1840 г., напісаны таксама па старабеларуску.

У сярэдзіне XVI ст. Вялікае Княства Літоўскае і Каралеўства Польскае аб'ядналіся ў новую дзяржаву – Рэч Паспалітую. На перыяд з сярэдзіны XVI па канец XVII ст. прыпадае росквіт шляхецкай культуры на беларускіх землях. Удзельная вага дваранскага саслоўя ў гэты перыяд была надзвычай высокай – шляхецкае званне мела кожная шостая сям'я. Адкрываліся шматлікія мануфактуры, ствараліся тэатры, будаваліся сядзібы, якія паступова пераўтвараліся ў палацава-паркавыя комплексы. Некаторыя з іх найшлі сваё адлюстраванне ў палотнах таленавітага мастака Напалеона Орды. На перыяд XVIII стагоддзя прыпадае актыўная гаспадарчая, грамадская, культурная, дзейнасць прадстаўнікоў шматлікіх знакамітых шляхецкіх родаў, адным з іх і быў знакаміты літоўскі род Храптовічаў.

Шматлікія населеныя пункты Беларусі маюць багатую гісторыю, валодаюць каштоўнай гісторыка-культурнай спадчынай, адпаведнымі рэсурсамі, што дае падставу для развіцця турыстычнай дзейнасці. З гэтага пункту гледжання нельга не звярнуць увагу на былыя беларускія сядзібы, фальваркі, маёнткі, на прыканцы XIX – пачатку XX ст. на тэрыторыі Беларусі іх налічвалася больш за 800. На сенняшні дзень яны амаль поўнасцю разбураны і паступова адыходзяць у занябыт, а ў свой час палацава-паркавыя комплексы выступалі захавальнікамі традыцый, звычаяў многіх шляхецкіх родаў, а гэта неад’емная частка гісторыі і культуры Беларусі і пэўны патэнцыял для развіцця цэлых турыстычных рэгіёнаў у нашай краіне.

**Асноўная частка**. Сядзіба старадаўняга літоўскага роду Храптовічаў размяшчалася ў пасёлку Шчорсы Навагрудскага раёна, зараз тэрыторыя Гродзенскай вобласці. Вядомасць Шчорсы набылі ў XVIII ст., дзякуючы падканцлеру ВКЛ графу І.Л. Храптовічу, які прыняў рашэнне аб будаўніцтве ў сваім маёнтку Шчорсы палацава-паркавага ансамбля ў стылі французскага класіцызму эпохі Людовіка XV. За рэалізацыю яго задумкі ўзяліся адны з лепшых еўрапейскіх майстроў: італьянцы Джузепе Сака і Карла Спампані і француз Якуб Габрыэль [1]. У 1776 г. будаўніцтва палаца, які стаў цэнтрам сядзібы, было завершана. Ён уяўляў сабой аднапавярховы будынак з двух'яруснай цэнтральнай часткай. Будынак адрозніваўся вытанчанасцю дэкаратыўных форм і лёгкасцю. З бакоў уезду палац замыкала агароджа з павятовымі варотамі, увенчанымі фігурай двухгаловага арла. Да палаца праз сад вяла цэнтральная ліпавая алея. Па сваей структуры яна напамінала галоўную алею ў Паўлаўскім парку. Завяршэннем усходняй перспектывы, з боку ўезду, было невялікае збудаванне вяндлярні (каля 10 м), з чырвонай цэглы ў выглядзе вежы з высокім гонтавым дахам і выпуклымі прадухамі. Сілуэт гэтага простага гаспадарчага

збудавання быў вельмі арыгінальны. Падобныя вежы з'яўляліся характэрным рамантычным элементам многіх беларускіх сядзіб.

Ваколь палацавага комплексу быў высаджаны пейзажны парк плошчай 40 га з сістэмай штучных азёр, які прымыкаў да партэра ў заходнім накірунку ад палаца. У аснову яго кампазіцыі былі пакладзены выцягнутыя ўздоўж двух вадацёкаў штучныя вадаёмы, па тры на кожным вадацёку. Тры паўнаводныя вадаёмы, плошчай больш за 2 га, мелі прастакутную форму і былі зарыентаваны, з перспектывай агляду, з кальцавога маршрута і партэра. Іх упрыгожваннем былі плаваючыя лебедзі. Сажалкі атачалі жывапісныя паляны з адзінкавымі дрэвамі або невялікімі групамі насаджэнняў. Паўднёва-ўсходні ўзлесак масіву ўпрыгожваў велізарны трохствольны дуб – найстарэйшае дрэва парку, напэўна, аднагодак маёнтка. Ён быў акцэнтам у зялёным аздабленні палаца. Пад яго кронай любілі збірацца госці, сябры гаспадара маёнтка. Нездарма гэты дуб стаў гістарычным, атрымаўшы назву «дуб Міцкевіча».

Вакол палаца знаходзілася мноства іншых цікавых пабудоў. Будынак у вобразе літары “Т”, з шасцікалоным порцікам перад цэнтральным вадаёмам, быў домам кіраўніка маёнтка. Заслугоўвае ўвагі і бібліятэка. Яна размяшчалася на верхнім паверсе палаца, спецыяльна вылучаным для бібліятэкі. На франтоне быў выбіты лацінскі надпіс «Paci et libertati». У адпаведнасці з духам таго часу Храптовіч у сваім палацы сабраў вельмі каштоўныя старадаўнія гравюры, польскія і замежныя фаліянты кніг, архіўныя дакументы і карты. Літоўскі канцлер набываў найбольш каштоўныя выданні сучасных аўтараў таго часу і перадрукі старых публікацый, назапашваючы ўнікальную калекцыю работ французскіх і польскіх аўтараў XVIII стагоддзя, а таксасма старажытных класікаў. Бібліятэка стала схронам для больш за 20 тысяч кніг на розных мовах, геаграфічных карт Беларусі, Літвы і Польшчы, унікальных гістарычных дакументаў.

Папрацавала ў гэтай бібліятэцы ў розныя часы шмат знакамітых людзей: паэты А. Міцкевіч, У. Сыракомля, Я. Чачот; гісторыкі І. Лялевель, І. Даніловіч, М. Маліноўскі. Як мяркуе Н.Л. Эрнст, першы дырэктар бібліятэкі ўніверсітэта Таўрыі, свод Храптовічаў налічваў прыблізна 7 600 назваў і больш за 10 000 тамоў [2]. Пасля смерці Адама Храптовіча бібліятэка не папаўнялася. З 1899 г. графскі тытул, маёнтак і бібліятэка перайшлі ў спадчыну Канстанціну Храптовічу-Буцянёву. Н.Л. Эрнст сцвярджае, што апошні гаспадар Шчорсаў, нашчадак Храптовічаў, граф Канстанцін Храптовіч-Буцянёў, прыняў рашэнне перадаць калекцыю бібліятэкі той установе, у якой яна была б даступнай навукоўцам, і з гэтай нагоды быў абраны ўніверсітэт св. Уладзіміра ў Кіеве. Тым не менш радавы сход Храптовічаў прыняў рашанне, што як толькі ў Вільні будзе адкрыты ўніверсітэт, фонды бібліятэкі адразу перадуць туды і гэта падкрэслівалася ва ўмовах перадачы [3, с. 17]. Частку калекцыі, нецікавую з пункту гледжання графа, у асноўным французскую белетрыстыку XVIII ст., уладальнік пакінуў сабе. У 1913 г. на захоўванне ўніверсітэту св. Уладзіміра ў Кіеве было афіцыйна перададзена прыкладна 7 000 тамоў (каля 4 500 найменняў).

На сенняшні дзень частка фондаў бібліятэкі Храптовічаў знаходзіцца ў Кіеўскім універсітэце, частка – у Акадэміі навук Украіны. Безумоўна, гэта ўжо фрагмент бібліятэкі, якая была сабрана ў Шчорсах і налічвала ў свой час, з пункту гледжання розных даследчыкаў, ад 10 000 да 20 000 тамоў [4]. Па дадзеных інвентарызацыі 1985 года, без рукапіснай часткі ў навуковай бібліятэцы Акадэміі навук Украіны знаходзілася каля 2 000 кніг. Рукапісная частка калекцыі на канец XX стагоддзя налічвала 119 рукапісаў XV–XIX стст, хоць па надрукаванаму каталогу Пташыцкага іх павінна быць 129 [4]. Гэта ў асноўным польскія і лацінскія манускрыпты, але сярод іх сустракаюцца беларускія, рускія, украінскія, французскія і арабскія.

Па сенняшні дзень нявырашаным застаецца пытанне, дзе павінны захоўвацца фонды бібліятэкі Храптовічаў. Перамовы аб магчымым вяртанні бібліятэкі ў Беларусь поспеху пакуль што не прынеслі, хаця на прыканцы XX стагоддзя ўкраінскі бок быў згодны з перадачай Беларусі гэтай культурнай спадчыны. Пытанне не простае, бо на валоданне бібліятэкай прэтэндуе і трэцяя старана – літоўская, Віленскі ўніверсітэт. Адам Мальдзіс, кіраўнік камісіі «Вяртанне» пры Беларускім фондзе культуры, адзначае: “Віленскі ўніверсітэт аднавіў сваю працу пасля Першай сусветнай вайны ў 1919 г. – на два гады раней, чым адкрыўся БДУ. Таму літоўцы і заявілі, што яны і ёсць першы ўніверсітэт, які адкрыўся на радзіме Храптовічаў і мае ўсе падставы прэтэндаваць на старадаўні свод” [4].

Паколькі вяртанне радавой бібліятэкі Адама і Яўхіма Літавора Храптовічаў у арыгінале пакуль што немагчыма, альтэрнатыўны варыянт – рэканструкцыя бібліятэкі Храптовічаў у электронным выглядзе, як электронны каталог усіх існуючых дакументаў з радавога збору Храптовічаў. Такім чынам кніжны збор беларускіх магнатаў Храптовічаў, які мае сусветнае значэнне, будзе не толькі захаваны для будучых пакаленняў, але стане адкрытым для шырокага кола даследчыкаў культуры і навукі.

Яўхім Літавор Храптовіч быў не толькі бібліяфілам, але і асветнікам, выбітным грамадскім дзеячам, руплівым гаспадаром. У пачатку XIX ст. польскі гісторык Тадэвуш Чацкі напісаў пра Яўхіма Храптовіча так: «Ён у людской свядомасці сваёй эпохі зрабіў такую рэвалюцыю, асабліва ў адукацыі, якая паставіла пакаленне XIX стагоддзя па свайму развіццю на два стагоддзі вышэй ад папярэдняга. Займаючыся дзяржаўнымі пытаннямі, ён любіў і паважаў навукі, і дадаваў моцай свайго генія

прыгажосці мове, якая нам дасталася ад нашчадкаў. Ён паказаў, як можна палепшыць стан гаспадаркі, не павялічваючы крэпасць (паншчыну), як асабістая свабода сялян уплывае на даходнасць» [5, с. 201]. Храптовіч быў першым, хто ўвёў севазварот ў Літве, актыўна развіваў прамысловую вытворчасць, ім былі пабудаваны і паспяхова дзейнічалі чыгуналіцейны завод у сваім маёнтку і знакамітая піваварня ў Шчорсах. Развядзенне коней і садоўніцтва таксама ўваходзілі ў кола яго гаспадарчых інтарэсаў. У маёнтку выраблялі фурманкі, колы, займаліся жывёлагадоўляй. Тут варылі найсмачнейшае ў гэтых мясцінах піва і выпякалі хлеб па арыгінальнай рэцэптуры, якія пастаўляліся ў Літву і Прусію. За тавар з маёнтка Храптовічаў традыцыйна давалі цэны значна вышэй біржавых. Менавіта ў сыраварні Шчорсаў, дзе працавалі швейцарскія майстры, выраблялiся лепшыя ў Мінскай губерні гатункі сыроў, якія пасля адпраўлялі ў Пецярбург. Вялікая колькасць сажалак давала магчымасць наладзіць рыбаводства. У маёнтку быў адкрыты броварны завод, алейня, была наладжана вытворчасць цэглы, дрэнажных труб, касцяной мукі для ўгнаення глебы. Былі ў Шчорсах лесапільня, тры млыны, адкуль гандляры адпраўлялі муку ў розныя гарады Расіі. Для гаспадарчых майстэрняў у другой палове XIX стагоддзя была пабудавана на ўскраіне сядзібы ў замкавым стылі так званая «Мураванка Храптовічаў». Маёмасць Храптовіча была апісана ў шматлікіх артыкулах таго часу, а яго метад вядзення гаспадарчай дзейнасці выступаў прыкладам для іншых. Сам Храптовіч, абапіраючыся на свой вопыт, апублікаваў эканамічны трактат, каб падзяліцца тагачаснымі перадавымі тэхналогіямі ў арганізацыі кіравання гаспадаркай буйных маёнткаў, якія нагадвалі зладжаны эканамічны механізм.

Ва ўсходніх ускраінах Рэчы Паспалітай у XVIII стагоддзі, развівалі і рэалізоўвывалі свае планы арыстакратычныя асяродкі, абапіраючыся на перадавыя ідэі тагачаснай еўрапейскай грамадскай і эканамічнай думкі. Ідэі, якія прапагандавалі іх уладальнікі, станавіліся прыкладам у галіне эканомікі, навукі, культуры і мастацтва. Палац у Шчорсах быў адным з такіх цэнтраў, дзе вядзенне гаспадаркі, унутраны сацыяльны клімат і сама мадэль кіравання былі выдзержаныя ў еўрапейскім стылі. Гэта было адмыслова выгадна і для ўладальніка, бо прыносіла пазітыўныя вынікі, і для яго жыхароў, бо давала магчымасці самастойна, сваёй працай, павышаць свой дабрабыт. У Шчорсах амаль на сто гадоў раней, чым на дзяржаўным узроўні, было фактычна адменена прыгоннае права. Насельніцтва, якое пражывала на гэтых тэрыторыях, амаль поўнасцю магло сябе забяспечыць, дзкуючы такому гаспадарчаму механізму, як маёнтак Храптовіча. Але здараліся і інцыдэнты, якія прыводзілі да абмену нават дыпламатычнымі нотамі паміж судамі Санкт-Пецярбурга і Варшавы. Мелі месца выпадкі ўцёкаў сялян з бліжэйшых тэрыторый маёнтка Храптовіча ў сядзібу Чартавіцы, якая была размешчана непасрэдна на мяжы першага падзелу Рэчы Паспалітай [6, с. 30].

У гады Першай сусветнай вайны палац Храптовічаў згарэў і ўжо не быў адноўлены. На працягу ўсяго XX ст. маёнтак паступова прыходзіў у заняпад. Гаспадарчыя пабудовы былі передадзены ў валоданне мясцовага калгаса. Сёння ў некалькіх уцалелых памяшканнях былога маёнтка размяшчаецца мясцовая адміністрацыя, адзін будынак адведзены пад дзіцячы сад. У будынку бібліятэкі раней размяшчалася школа, потым – мастацкія майстэрні, а цяпер будынак пустуе і паступова разбураецца. Англійскі пейзажны парк плошчай 40 гектараў, дзе ў свой час расло больш за 200 відаў раслін, сёння нагадвае дзікі лес. Каскадная сістэма сажалак выглядае як шэраг балот. Захаваліся толькі фрагменты сядзібы: двухпавярховы будынак бібліятэкі; квадратны дом, дзе жыла прыслуга; вяндлярня; развалiны гаспадарскага двара. Засталіся і вялізныя бетонныя слупы, падставы агароджы, якая акружала ўвесь маёнтак. На месцы, дзе стаяў палац, захаваліся напаўразваленыя сховішчы-склепы.

Сення Шчорсы з'яўляюцца часткай турыстычнага маршрута, які праходзіць праз Нясвіж – Свет – Турэц – Карэлічы – Навагрудак. Але сядзіба не разглядаецца як перспектыўны турыстычны аб’ект, хоць яе месцанаходжанне характарызуецца зручнай транспартнай даступнасцю, магчымасцю арганізаваць турыстычныя маршруты ў Любчу, Навагрудак, на возера Свіцязь. І, безумоўна, маляўнічыя сельскія краявіды маюць вялікае значэнне для часовага і сезоннага адпачынку. Сядзіба Храптовічаў, пасля правядзення шэрагу мерапрыемстваў па аднаўленню гэтага палацава-паркавага комплексу, магла б прэтэндаваць на ўключэнне ў турысцкі маршрут «палацы і замкі Навагрудчыны» альбо нават разглядацца як абасоблены турыстычны комплекс. Эканамічнае, сацыяльнае, культурнае жыццё Шчорсаў на сенняшні дзень амаль цалкам залежыць ад развіцця ў гэтым рэгіёне турыстычнай дзейнасці, агра- і экатурызму. Гістарычная і культурная спадчына, якой валодаюць Шчорсы, важны аргумент у гэтай справе. Безумоўна, “мінулая веліч Шчорсаў” зараз у заняпадзе: гістарычны парк сядзібы знаходзіцца ў незадавальняючым стане, тэрыторыя падтапляецца, асноўныя пейзажныя кампазіцыі парушаныя, пасадкі загушчаны. Але пры належных умовах і жаданні парк і сядзібу Храптовічаў можна яшчэ рэканструяваць. Адноўлены сядзібны турыстычны коплекс стаў бы галоўным кампазіцыйным, сэнсавым цэнтрам пасёлка і музеем мясцовай матэрыяльнай культуры, дзе былі б прадстаўлены кузня, ганчарная майстэрня, сыраварня, хлебапякарня, дзе можна пазнаёміцца з мясцовымі, адроджанымі па апісаннях тэхналогіямі вырабу і прыгатавання, а таксама традыцыямі і звычаямі. Нельга не ўспомніць і пра бібліятэку Храптовіча з яе аранжарэямі і залямі для адпачынку. Адбудаваны будынак бібліятэкі мог бы паслужыць ідэальным месцам для карціннай галерэі, музея ці нават гасцінічнага комплексу.

Рэканструяваная паркавая зона сядзібы стала б ідэальным месцам для правядзення рыцарскіх турніраў, тэматычных кірмашоў пад адкрытым небам і прыгожым маршрутам для катання конна. Нават планіроўка пасёлка набыла б новыя абрысы – адноўленыя бульвары ў перспектыве маглі б аб'яднаць жылыя тэрыторыі з грамадскім цэнтрам, захоўваючы выразны падзел на функцыянальныя зоны [7].

**Заключэнне**. У Рэспубліцы Беларусь распрацавана і прынята Дзяржаўная праграмма “Беларусь гасцінная” на 2016–2010 гады (Праграмма), якая прадугледжвае комплексны падыход да развіцця турыстычнай дзейнасці ў нашай краіне. Па асноўных паказчыках Праграммы чакаецца істотны рост колькасці як айчынных, так і замежных турыстаў. Развіццё індустрыі гасціннасці, стварэнне спрыяльных умоў для турызму, нацэленага на азнаямленне з гісторыка-культурнай і прыроднай спадчынай нашай краіны, становяцца аднымі з галоўных прыярытэтаў дзяржаўнай палітыкі ў галіне сацыяльна-эканамічнага развіцця.

У Беларусі шмат паселішчаў, якія змагаюцца і з часам, і з забыццём. Некалі перажыўшы росквіт, яны сёння толькі ва ўспамінах чэрпаюць сілу, для таго каб развівацца і жыць далей ім неабходны прыток новых сіл, новых ідэй і новых магчымасцяў.

ЛІТАРАТУРА

1. Mirowski, R. Na Kresach – Szczorse Pałac [Electronic resource] / R. Mirowski. – Mode of access: http://romanmirowski.com/29-na-kresach-szczorse-palac. – Date of access: 14.07.2016.
2. Мальдис, А. Дар или депозит [Электронный ресурс] / А. Мальдис // Беларусь сегодня. – Режим доступа: http://www.sb.by/kultura/article/dar-ili-depozit.html. – Дата доступа: 21.04.2017.
3. Эрнст, Н. Библиотека графов Хрептовичей: к передаче ее Университету св. Владимира / Н. Эрнст // Русский библиофил. – 1914. – № 6. – С. 21.
4. Лицкевич, С. Тайна библиотеки Хрептовичей [Электронны рэсурс] / С. Лицкевич // Беларусь сегодня. – Режым доступа: //www.sb.by/forum/article/tayna-biblioteki-khreptovichey.html. – Дата доступа: 01.04.2017.
5. Караев, Д. Храптовичы: род и яго прадставители в европейским историко-культурном контексте / Д. Караев // Наукові праці історичного факультэту Запорізького національного університету. – Запоріжжя : ЗНУ, 2013. – Віп. XXXVII. – З. 200–205.
6. Roćko, A. For Peace and Freedom / A. Roćko // Academi. – 2004. – N. 2 – P. 30–31.
7. Нитиевская, Е. Особенности развития сельских поселений Беларуси с ценным историко-культурным наследием (на примере поселка Щорсы) / Е. Нитиевская – Режым доступа: http://www.wa.pb.edu.pl/uploads/downloads/Architektura-1-2011-artykul-V.pdf. – Дата доступа: 01.04.2017.

*Пастyпiў 19.04.2018*

## HERITAGE OF BELARUS: MANOR HREPTOVICHA IN SHCHORS

*Tourism in the world today is one of the most massive and intensive industries to develop the world economy. The development of the tourist function in rural areas with the shadow of historical heritage are needed to improve the system of public services. In addition, the creation of favorable conditions for tourism, aiming to explore the historic, cultural and natural heritage is important for the development of tourism opportunities. Manor in Shchors, which is now destroyed and forgotten, the ancestral home of the family Litavora Hreptovicha – an important monument of Belarusian culture, which could be a historic and tourist center of Belarus.*

***Keywords**: historical heritage, tourism opportunities, historical and cultural potential.*